**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск

тэл. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

Проспект Победителей, 11, 220004, г. Минск

тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

15.03.2017 № 01-19/04-198
На № __________ от __________

Аб разглядзе звароту

Міністэрства культуры разгледзела зварот аб наданні статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці традыцыі дарэння шкарпэтак мужчынам на 23 лютага і паведамляе наступнае.

Парадак унясення адпаведных прапаноў вызначаны артыкулам 90 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс), згодна з якім да прапановы аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці дадаюцца:

матэрыялы фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі культурнай каштоўнасці;

абгрунтаванне неабходнасці надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Патрабаванні да парадку фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі культурных каштоўнасцей утрымліваюцца ў артыкуле 91 Кодэкса.

У прадстаўленай прапанове адпаведныя матэрыялы адсутнічаюць.

Згодна з пунктам 10 артыкула 93 Кодэкса прапанова аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, якая не адпавядае патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 90 гэтага Кодэкса, Міністэрствам культуры не разглядаецца і вяртаецца асобе, якая яе ўнесла.

Дадаткова паведамляем, што апрача Кодэкса дзейнасць па ахове нематэрыяльных праўленняў творчасці чалавека грунтуецца на падставе Канвенцыі ЮНЕСКА аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – Канвенцыя), да якой Рэспубліка Беларусь далучылася згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2004 № 627.

Згодна з артыкулам 2 Канвенцыі да нематэрыяльнай культурнай спадчыны адносяцца звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і

навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны.

Вызначальнай роляй у дадзеным выпадку з'яўляецца наяўнасць пэўнай супольнасці альбо групы людзей, якія з'яўляюцца носьбітамі і карыстальнікамі культурнай каштоўнасці, і прызнаюць яе ў якасці сваёй спадчыны. Менавіта праз супольнасці і групы ў межах іх навакольнага асяроддзя, ва ўзаемадзеянні з прыродай і іх гісторыяй ад пакалення ў пакаленне перадаецца нематэрыяльная культурная спадчына.

Перад унясеннем прапановы аб наданні статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Міністэрства культуры ў мэтах апісання і захавання элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны праводзіцца яго ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя пры непасрэдным удзеле супольнасцей, груп, асоб і адпаведных няўрадавых арганізацый.

Для забеспячэння такой дзейнасці ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь УА "Інстытут культуры Беларусі" у супрацоўніцтве з Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кафедрай этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў была распрацавана канцэпцыя Нацыянальнага інвентара нематэрыяльнай спадчыны Беларусі, а таксама намінацыйная форма для ўключэння элементаў нематэрыяльнай спадчыны ў гэты інвентар разам з метадычнымі рэкамендацыямі па яе запаўненню, азнаёміцца з якімі можна ў электронным выданні "Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны: практычнае кіраўніцтва" (http://www.livingheritage.by/Publikacyi/Praktycznaje_kiraunictva.pdf.).

Рэкамендуем падрыхтаваць прапанову аб наданні статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці традыцыі дарэння шкарпэтак мужчынам на 23 лютага ў адпаведнасці з палажэннямі Кодэкса і Канвенцыі.

Дадзены адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткаю першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Намеснік Міністра В.М.Чэрнік

11 Ходар 209 43 87
13.03.2017